УДК 37(476)(091)“17”

# ПЫТАННЕ АБ АФІЦЫЙНЫМ СТАТУСЕ МАГІЛЁЎСКАЙПРАВАСЛАЎНАЙ СЕМІНАРЫІ Ў КАНЦЫ 1750-х – 1760-я ГАДЫ

*Самусік Андрэй Фёдаравіч*
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі
ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*Аналізуецца гісторыя Магілёўскай праваслаўнай семінарыі ў канцы 1750-х – 1760-я гг. Адзначана наяўнасць пагрозы існаванню з прычыны адсутнасці юрыдычнага пацверджання яе дзейнасці. Разгледжаны напад на семінарыю ў 1760 г. езуіцкіх выхаванцаў і яго наступствы. Паказаны працэс атрымання ёй афіцыйнага прызнання як з боку улад Расіі, так і Рэчы Паспалітай.*

На сярэдзіну XVIII ст. стуацыя з праваслаўнай адукацыяй на тэрыторыі Беларусі была крытычнай. Нешматлікія пачатковыя школы працавалі пры асобных цэрквах, а жадаючыя атрымаць якасную падрыхтоўку былі вымушаны адпраўляцца ў Кіева-Магілянскую акадэмію. Становішча пачало змяняцца ў 1755 г. калі магілёўскім епіскапам быў прызначаны рэктар згаданай навучальнай установы Г. Каніскі, які адразу ж заняўся добраўпарадкаваннем сваёй епархіі. Клапаціўся ён і аконт паляпшэння асветы мясцовага святарства. Для гэтага ў 1757 г. епіскап адкрыў у трапезнай Магілёўскага Спаскага манастыра пачатковыя класы [1, с. 107–109]. Трэба адзначыць, што брацкая школа ў гэтым горадзе спыніла сваё існаванне яшчэ ў часы Паўночнай вайны і першапачаткова Г. Каніскі вёў гаворку аб яе аднаўленні, што дазваляла яму падвесці юрыдычную базу для абгрунтавання правамоцнасці заснавання тут праваслаўнага вучылішча. Іерарх заяўляў, што адпаведныя прывілеі караля Жыгімонта ІІІ Вазы ды іншых манархаў Магілёўскаму Богаяўленскаму брацтву не страцілі сваёй актуальнасці і пацвярджаюць правамоцнасць яго асветніцкіх намаганняў [2, с. 57].

Разам з тым падобнае сцвярджэнне было даволі спрэчным (замест ранейшай свецкай школы епіскап планаваў адкрыць духоўную семінарыю) і не давала ніякіх матэрыяльных выгад, бо казны брацтва, як і саміх братчыкаў, даўно не існавала. У выніку Г. Каніскі вырашыў за лепшае звярнуцца ў Пецярбург і ўключыць фінансаванне ўласнай навучальнай установы ў агульны бюджэт Рускай праваслаўнай царквы. Яго хадайніцтва было адобрана і 31 студзеня 1757 г. Св. Сінод звярнуўся да імператрыцы Елізаветы з афіцыйнай просьбай зацвердзіць выдзяленне сродкаў для Магілёўскай епархіі і “особливо о определении на учреждение и содержание там вновь семинарии, с принадлежностию, коей, по тамошнему состоянию, для православного благочестия, к пользе святой церкви весьма нужно потребно и необходимо быть должно, хотя да четырех сот рублев на год…”. 25 студзеня 1758 г. імператарскім указам грошы былі выдзелены, на пастаяннай аснове яны паступалі “из Синодальных доходов” [3, с. 276–277, 315–316].

Магілёўская семінарыя пачала сваю працу ў 1759 г. Пры гэтым стаўленне да яе з боку пераважна каталіцка-уніяцкага мясцовага грамадства было негатыўным і замежнае фінансаванне толькі пагаршала сітуацыю. Найбольш ваяўніча былі настроены езуіты. 20 студзеня 1760 г. адбыўся напад на семінарыю мясцовай шляхты і езуіцкіх выхаванцаў. Маецца ажно тры апісанні гэтай падзеі. Па-першае, сам епіскап 10 верасня 1760 г. і 5 снежня 1762 г. скардзіўся ў Св. Сінод, што “иезуитские студенты, по наущению плебана Михаила Зеновича, напав на семинарию били учеников нещадно брёвнами и саблями и одному руку жестоко изрубили. А от сего случая священство епархии моей и граждане здешние детей своих в семинарию давать опасаються, почему и число учеников не великое до сих пор находится” [4, с. 269]. Па-другое, у час свайго знаходжання



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў Варшаве ў 1765 г. Г. Каніскі склаў “Мемарыял”, дзе апісваліся крыўды, якія прычынілі каталікі ды ўніяты праваслаўным за апошнія гады. У 16-м пункце тут таксама распавядалася аб гэтай падзеі, прычым епіскап адзначаў, што калі ён выйшаў да нападнікаў, то ў яго “цэліліся з фузіі (*стрэльбы* – А.С.)”. Потым жа яшчэ некалькі дзён езуіцкая вучнёўская моладзь хадзіла вакол рэзідэнцыі праваслаўнага іерарха і “гаманіла” [5, с. 50]. Па-трэцяе, узгадваў азначаны выпадак і І. Грыгаровіч, які ў 1835 г. выдаў збор твораў Г. Каніскага: “Изверг (*М. Зяновіч.* – А.С.) жаждал крови. Он искал умертвить Георгия. И так согласясь с Езуитами, вместе с Префектом их Бадовским, предводительствуя толпою воспитанников, с ружьями, саблями, камнями, дубинами, напал он, ночью, на Архиерейский дом и Семинарию. С бешенством разломав ворота, они бегали, кричали, стреляли, били стекла, переранили несколько учеников, монахов, служителей. Никто не знал, где скрыться, или куда бежать. Преосвященный принужден был искать спасения от наглецов в низких, сырых подвалах своего дома” [6, с. XXIV]. Шырока ж вядомым апошняе апісанне зрабіў А. С. Пушкін, які ва ўласнай рэцэнзіі на дадзенае выданне змясціў яго ў крыху скарочаным выглядзе [7, с. 86–87].

Г. Каніскі лічыў, што ў адказ за гэты ўчынак М. Зяновіча неабходна “российскою командою взять секретно в Россию на спокойнейшее пребывание, каким одним случаем всё духовенство римское далеко больше убоялось бы и воздержалось от изобиждений, нежели многочисленными рескриптами королевскими”. Таксама Г. Каніскі прасіў размесціць хаця б батальён рускіх войскаў у Магілёве для аховы яго рэзідэнцыі [4, с. 108–109]. Аднак Кацярына ІІ абмежавалася тым, што 14 кастрычніка 1762 г. загадала сваім прадстаўнікам у Варшаве (паслу Кэйзерлінгу ды рэзідэнту Ржычэўскаму) “всевозможное старание приложить… чтоб… плебан Зенович… за многие его греческого закона людям причиненные обиды… штрафован и от плебанства могилевского отрешён был” [8, с. 150–151].

Дыпламаты звярнуліся са скаргай да маршалка вялікага кароннага Ф. Бялінскага, які перапаручыў справу віленскаму біскупу І. Масальскаму. Апошні ж параіў Г. Каніскаму звярнуцца ў суд. Акрамя таго, ён адзначыў, што семінарыю трэба ўвогуле зачыніць, бо падобных каталіцкіх публічных школ у Расіі няма. З гэтай нагоды ён заявіў наступнае: “Трактат, якім ўзаемна дазволена свабоднае адпраўленне як грэка-расійскай веры ў Польшчы, так і рымскай каталіцкай ў Расійскім дзяржаве, ці можа тым самым служыць для ўтрымання семінарыі альбо публічных школ і выкладання ў іх навук, чаго ў Расіі для каталіцкай канфесіі зусім няма: гэта сумнеўна, бо патрэбна яшчэ мець і станоўчую рэзалюцыю ўсіх чыноў рэспублікі, якім непрыстойна дазволіць распаўсюджваць публічныя навукі і ўтрыманне семінарыі, ды і нельга такога насамрэч патрабаваць ад каталіцкай канфесіі”. У выніку апраўдвацца ўжо быў вымушаны Г. Каніскі, які ў адказ пісаў наконт статусу сваёй школы наступнае: “Семинария не есть публичное, но приватное училище для обучения детей православных и таковые же училища находятся при костёлах и в России, и учение в них происходит без всякого препятствия” [4, с. 269].

Дадзены ліст магілёўскага епіскапа лепшым чынам дэманструе асабістае разуменне іерарха неафіцыйнасці “прыватнасці” яго семінарыі, а значыць яе прававой неабароненасці. Для выпраўлення сітуацыі Г. Каніскі звярнуўся з просьбай аб дапамозе да Кацярыны ІІ. Руская імператрыца дабілася афіцыйнага яе прызнання ад улад Рэчы Паспалітай. Адпаведна “Вечнаму трактату”, які быў заключаны 13 (24) лютага 1768 г., у 12 параграфе дадатковага Сепаратнага акта адзначалася: “Семинарии или школы для особ приуготовляющихся к духовному чину, и воспитании не Униатских детей дворянских или мещанских, тож приходские школы для научения юношества своей веры артикулам их исповедания, как давние, так и те, кои бы впредь в местах, где живут не Униаты, построены были, особливо же Семинария Могилевская действительно состоящая, не должны ни кем быть беспокоиваны” [9, с. 457].

Кароль Станіслаў Аўгуст афіцыйна пацвердзіў у асобным прывілеі ад 18 красавіка 1768 г. правы семінарыі, а таксама дазволіў яе перанос у Мікольскі манастыр на тэрыторыі старажытнага Пакроўскага пасаду. Рашэнне манарха было агучана наступным чынам: “Прасіў нас шаноўны Георгій Каніскі… заяўляючы, што ён жадае вучылішча, у горадзе нашым Магілёве заснаванае для адукацыі юнацтва Рускага праваслаўнага народа ў вучэнні ўсходняй Грэчаскай набожнай веры, таксама ў мовах Лацінскай ды Грэчаскай і іншых навуках, прыстойных жыхарам гэтага краю – перанесці сваім утрыманнем на адасобленае, зручнае месца, менавіта на прадмесце да царквы св. Мікалая… Мы, Кароль, падтрымліваючы міласціва гэтае прашэнне, дазваляем перамясціць і выбудаваць на азначаным месцы, каля царквы св. Мікалая, драўлянае альбо каменнае вучылішча для адукацыі юнакоў…” [10, с. 143–144].

Гэтае каралеўскае рашэнне завяршыла працэс афіцыйнага прызнання Магілёўскай праваслаўнай семінарыі. Прычым аб нейкай пераемнасці паміж ёю і брацкай школай гаворка ўжо не вялася. Яе ж пераезд быў выкліканы тым спадзяваннем Г. Каніскага, што адасобленае размяшчэнне манастырскага комплексу ў пойме Дняпра гарантавала больш спакойнае знаходжанне там настаўнікам і іх выхаванцам. Так і адбылося – пры Мікольскім манастыры семінарыя праіснавала ажно да 1780–1785 гг., калі спецыяльна для яе ўзвялі новыя будынкі пры Спаскім манастыры [11, с. 41]

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Буглаков, М. Преосвященный Георгий Конисский, Архиепископ Могилевский / М. Буглаков. – Минск : Виноград, 2000. – 656 с.
2. Mironowicz, M. Działalnosc szkoły brackiej w Mohylewie od II połowy XVI wieku do XVIII wieku / M. Mironowicz // Elpis. – 2017. – № 19. – S. 51–58.
3. Полное собрание постановлений и распоряжений по ведомству православного исповедания Российской империи : собрание второе : в 4 т. – СПб. : Синод. тип., 1899–1912. – Т. 4. – 1912. – 619 с.
4. Чистович, И. Очерк истории западно-русской церкви : в 2 ч. / И. Чистович. – СПб. : Тип. Департамента уделов, 1882–1884. – Ч. 2. – 1884. – 419 с.
5. Łubienska, M. C. Sprawa dysydencka 1764-1766 / M. C. Łubienska. – Warszawa ; Krakow : Gebethner i Wolff, 1911. – XX, 194 s.
6. Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского : в 2 ч. / сост. прот. И. Григорович. – СПб. : Тип. Э. Веймара, 1861. – Ч. 1. – LXVII, 291 с.
7. Пушкин, А. С. Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа белорусского. Изд. протоиереем Иоанном Григоровичем. СПб., 1835 / А. С. Пушкин // Современник. Литературный журнал. – 1836. – Т. 1. – С. 85–110.
8. Сборник Императорского Русского Исторического Общества : в 148 т. – СПб. ; М., 1867–1916. – Т. 48. – М. : Унив. тип., 1885. – LI, 660 с.
9. Полное Собрание Законов Российской Империи : Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 года : в 48 т. – СПб. : Тип. II Отд-ния собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. – Т. 18 : 1767–1769. – 1033 с.
10. Белорусский архив древних актов / сост. И. Григорович. – Москва : Тип. С. Селивановского, 1824. – 148 с.
11. Павлович, М. Г. Георгий Конисский, арх. Могилевский / М. Г. Павлович // Христианское чтение. – 1873. – № 1. – С. 3–46.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова